*Майстэрства творцы*

Кацярына ПІВАВАР,
кандыдат філалагічных навук

# "БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ..."

## КАНЦЭПТ *ЖЫЦЦЁ* Ў ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

УДК 811.161.3:008

У артыкуле прапануецца рэканструкцыя канцэпту *жыццё* на матэрыяле творчасці М. Гарэцкага. Вылучаны каштоўнасны, вобразны, паняццевыя складнікі канцэпту, яго цесная сувязь з ключавымі канцэптамі беларускай моўнай карціны свету: *Бог, час, шчасце, смерць.* Разгледжаны канцэпт вельмі значны для разумення карціны свету класіка беларускай літаратуры, жыццё якога прыпала на час карэнных змен у грамадстве.

Ключавыя словы: канцэпт *жыццё*, індывідуальна-аўтарская карціна свету, М. Гарэцкі.

The article offers a reconstruction of the concept of life based on the work of M. Haretsky. The valuable, figurative and conceptual components of the concept are highlighted, its close connection with the key concepts of the Belarusian language picture of the world: *God, time, happiness, death.* This concept is significant for understanding the picture of the world of the classic of Belarusian literature, whose life coincided with radical changes in society.

Мастацкі тэкст надзвычай важны ў плане захавання культурнай інфармацыі, паколькі ён сам выступае пэўнай формай культуры. Аналіз тэкстаў дазваляе выявіць асаблівасці індывідуальнай карціны свету аўтара, супаставіць яе з агульнанацыянальнай. Гэта дае магчымасць ацаніць месца і ролю мастацкай творчасці аўтара ў культурнай парадыгме народа. Большасць даследчыкаў вылучае нацыянальную, групавую і індывідуальную карціны свету. Апошняя часта вывучаецца на матэрыяле творчасці пісьменнікаў, таму яе называюць паэтычнай, або мастацкай. Калі моўная карціна свету ўніверсальная, а творцам яе з'яўляецца ўвесь народ, то мастацкая (паэтычная) – індывідуальная, яна ствараецца ў тэкстах аднаго чалавека, прадстаўніка пэўнага народа. Такім чынам, моўная карціна і карціна свету, якая рэканструюецца на матэрыяле мастацкіх тэкстаў аднаго аўтара, суадносныя. Як справядліва адзначае В. Паставалава, пазачалавечых і ўсёчалавечых карцін свету не бывае, таму кожная індывідуальная карціна свету ўтрымлівае хоць бы часцінку нацыянальнай і агульначалавечай карцін свету. Яна піша: "...у строгім сэнсе слова, існуе столькі карцін свету, колькі ёсць назіральнікаў, якія кантактуюць са светам" [3, с. 32].

Індывідуальна-аўтарская карціна свету ў пэўнай ступені суб'ектыўная і нясе ў сабе рысы моўнай асобы яе стваральніка. Гэта вобразная, "ачалавечаная" карціна, у якой асоба пісьменніка ўяўляецца як адлюстраванне яе існавання. Мэта артыкула – рэканструяваць канцэпт *жыццё* на матэрыяле твораў М. Гарэцкага [1].

Максім Гарэцкі – класік беларускай літаратуры, пісьменнік-філосаф, які з асаблівай увагай звяртаўся да экзістэнцыяльных паняццяў – жыцця, яго сэнсу, душы, чалавечага наканавання. У 1913 г. малады Гарэцкі пісаў: "*Я жыць хачу вольным жыццём – жыццём радасці, добрага, вясёлага смеху і ўсяго таго, што побач з другім творыць гармонію жыцця. Я хачу новага, лепшага жыцця. Я крэпка, усімі сваімі сіламі жадаю яго!* <...> *Я скіну, сарву ланцугі свайго старога жыцця і зраблю жыццё новае! Зраблю! Парву ланцугі спрадвечнай гульні-лені, ланцугі глуму, шальмоўства і страшэннай, аграмаднай цемнаты векавечнай...*" [1, с. 5]. Пазней у творы "Скарбы жыцця" пісьменнік, на жыццёвы шлях якога выпалі шматлікія выпрабаванні, зрабіў пэўнае падсумаванне: "*...цану рэчам пазнаў. Людзей да самых глыбінь уведаў. Жыццём даражыць навучыўся. І да смерці сябе рыхтаваць я ўмею. Каб прыняць яе меч хоць калі, і без пары, і без усякай патрэбы. Дык слава жыццю! Слава і смерці!*" [1, с. 550].

Выбар канцэпту *жыццё* ў якасці аб'екта даследавання абумоўлены шэрагам прычын. Рэфлексія над жыццём уласціва многім персанажам твораў М. Гарэцкага, таму вывучэнне адназначнага канцэпту на матэрыяле творчасці менавіта гэтага пісьменніка выклікае асаблівую цікавасць. Разуменне жыцця, адносіны да яго ў любой лінгвакультуры ўяўляюць сабой этнаспецыфічныя нормы і стэрэатыпы камунікацыі, а таксама адлюстроўваюць ментальнасць носьбітаў мовы.

Максім Гарэцкі па-майстэрску карыстаецца беларускім словам, ствараючы яркія вобразы. Прывядзем прыклады ўжывання фразеалагізмаў з кампанентамі *жыць* (*жыццё*): *Радзіўся я на маслянку. Пілі многа піва, і елі сыр з маслам, і жадалі мне, каб* ***качаўся я ў жыцці, як сыр у масле*** ("Віленскія камунары"); *Так і* ***прамарудзіць задарма жыццё*** *сваё: ні богу свечка, а ні чорту чапяла, ні пан, ні нашчанец, мужыцкі брат* ("Дзве душы"); *Ты ганіш мяне і кажаш, што ныццём і хныканнем мы ніколі* ***не возьмем жыцця ў свае рукі*** ("Меланхолія"); *безнадзейна тошчы ад* ***выпітых салодкасцей жыцця*** ("Ге-

нарал”); ***светач жыцця гарэў*** *цьмяна*; ***томна*** *было* ***жыць***; *прытарнаваўся да свайго* ***новага жыцця*** і г. д.

Большасць даследчыкаў вылучае ў структуры канцэпту вобразны, каштоўнасны і паняццевыя складнікі. Вобразны кампанент гэтага канцэпту ў творчасці М. Гарэцкага можна ўявіць праз вобразы шляху, дарогі: *І хацелася пісаць яшчэ, каб выпісаўшы на паперы – зацвердзіць яшчэ лепей усё тое, што бараніла яго погляды, што паказвала яму шлях у жыцці* (“У чым яго крыўда?”); *Лёс мой – на ростанях стаяць, пэўных дарог сваіх не ведаць, у лесе думак і ўчуццяў блудзіць* (“Скарбы жыцця”). Не выклікае сумнення, што моцная асацыятыўная сувязь жыцця і дарогі ўласціва моўнай карціне свету беларусаў, і гэта можна пацвердзіць кантэкстамі з твораў іншых беларускіх пісьменнікаў [2]: *Жыццё – бы той гасцінец, па якім праходзім вярсту за вярстою* (С. Яновіч. Гасцінец); *Шлях, які не пройдзеш двойчы, / Называецца – Жыццё!* (К. Камейша. Шлях, які не пройдзеш двойчы…). Думаецца, названы вобразны кампанент універсальны, уласцівы карціне свету многіх народаў. Але ў Максіма Гарэцкага знаходзім таксама і нечаканае аўтарскае ўяўленне жыцця як памяшкання: *Выйшаў я з* ***муру жыцця*** *свайго на сонца, на вольнае паветра, на ясны свет* (“Скарбы жыцця”); *А* ***пакой жыцця*** *майго быў прахадны. І хадзілі па ім, і снавалі праз яго – безупынку…* (“Скарбы жыцця”).

У кантэкстах актуалізуюцца ацэначныя характарыстыкі жыцця, сярод якіх вылучым як станоўчыя (*тут жа мляўкі халадок незлавімым маленцікам ахапіў яму сэрца: шкода было жыцця, адчуў, што моцна любіць жыццё…* (“Меланхолія”); *Сцюдзёна дзеду… Што й то жыццё? Нашто жылося? А жадаецца жыць… Нічога зразумелага, усё няведама* (“Што яно?”), так і з негатыўнай афарбоўкай. Нярэдка героі М. Гарэцкага расчароўваюцца ў жыцці, не прымаючы яго несправядлівасці і жорсткасці: *Жыццё, жыццё, ці ж ты вартае таго, каб жыць?* (“Што яно?”); *Як брыдка ўсё ж бывае часам жыць на свеце* (“Рунь”).

Назіранні над кантэкстамі, у якіх рэпрэзентуецца даследаваны канцэпт, прыводзяць да высновы пра асаблівую значнасць для беларускага народа такіх каштоўнасных установак, як мудрасць, веданне сваёй гісторыі, працавітасць: *І быў тады шчаслівы, здаволены жыццём – жыццём аратая, бо ў тым была праўда жыцця…* (“Ціхая плынь”); *Першае, што скажу я табе, гэта – чытай, галубец, у кніжках і ў разумных людзей пытайся, як жылі даўней нашы тутэйшыя людзі… Споўніш гэты загад – у жыцці не ашукаешся, будзеш ведаць, што рабіць трэба* (“Роднае карэнне”); *Люба жыць сярод працы, свяцейшай усіх прац, – працы земляроба. Люба мець здаровае цела і здаровы дух* (“Роднае карэнне”).

Аналіз сінтагматыкі ключавога слова, якое аб’ектывуе ў тэксце аднайменны канцэпт, дае магчымасць выявіць пэўныя дадатковыя прыметы. Разгляд ужыванняў слова *жыццё* ў тэкстах М. Гарэцкага паказаў, што яно функцыянуе ў большасці выпадкаў у двух слоўнікавых значэннях: ‘фізіялагічнае існаванне жывога арганізма’ (*Яшчэ змалку атручаў жыццё сваёй ціхай, добрай матцы і ганарліваму, наравістаму бацьку*; “Габрыелевы прысады”) і ‘перыяд існавання чаго-небудзь – краіны, народа’ (*Ён жа не чураецца вёскі, любіць яе і шануе, як родны сын, што ён хоча кіравацца ўсімі сіламі, каб бачыць яе цвярозай, светлай, задаволенай жыццём ды сумленнай*; *Як многа слаўнага ў нашых вёсках, сёлах, а тым часам як яны непарушна-мёртвыя ў жыцці*; *Уголас задаў ён сабе пытанне і размеркаваў, што доктарам будзе служыць на Беларусі і будзе збіраць матэрыялы аб духоўным жыцці свайго народа; калі задумаў пісаць доўгі раман, у якім спадзяваўся ахапіць жыццё Беларусі з усіх бакоў, ува ўсе часы і да самых драбніц*; “Роднае карэнне”).

Выяўленыя кантэксты адлюстроўваюць вітальную, біялагічную сутнасць жыцця і яго сацыяльны складнік, што ілюструецца праз ужыванне эпітэтаў: *панскае, вайсковае, ціхамірнае, даўнейшае, хатняе, астрожнае жыццё*. У многіх выпадках слова *жыццё* спалучаецца з дзеясловамі, дзякуючы чаму ўзнікаюць новыя значэнні ў выніку метафарычнага пераасэнсавання: *І* ***пацякло*** *яно – звычайнае, штодзённае, будзённае* ***жыццё****… І ў школе, і ў горадзе, і ў Цёмналессі* (“У чым яго крыўда?”); *Я спагадаю табе… Толькі* ***жыццё*** *няяк* ***не спрыяе*** *таму* (“Амерыканец”); *Гэтак* ***цягнецца і вее сумам*** *нашае* ***жыццё****…* (“Ціхая плынь”); *Так….* ***жыццё бяжыць***, ***не стаіць на месцы***; ***Жыццё ідзе, ідзе****… да нечага.* У многіх з такіх кантэкстаў выяўлены паняццевы кампанент ‘улада жыцця над чалавекам’: *Твой* ***скрыўджаны жыццём*** *Лявон Задума* (“У чым яго крыўда?”); *але часта-часта* ***жыццё*** *нічагусенькі* ***не пакідае*** *нам і робіць жаласнымі старцамі без пары* (“Ціхая плынь”); *А можа, у цёмную восеньскую ночку прыедзе гаротнік, згубіўшы лепшае сваё, і як* ***жыццё ссекла радасць яму****, так ссячэ і ён тую бярозку ў прысадах і знішчыць тую частку вечнае думкі і хараства* (“Габрыелевы прысады”); *Быў я цяпер вельмі цярплівы:* ***жыццё*** *мяне* ***навучыла****…* (“Скарбы жыцця”).

Важны этап апісання канцэпту – вызначэнне яго сувязей з іншымі канцэптамі. Так, аналіз

асацыятыўных сувязей слова *жыццё* ў тэкстах паказаў, што адзін з яго ўстойлівых асацыятаў – слова *Бог*. Адлюстравана ўласцівая хрысціянскаму светапогляду перакананасць у тым, што Бог мае поўную ўладу над зямным жыццём чалавека, уяўленне, што Божыя міласць ці гнеў залежаць ад таго, наколькі праведна жыве чалавек: *Адно астанецца людзям навекі святою загадкаю – гэта тварэц наш найвышні. Каб не было дано людзям гэтай загадкі, не было б чалавецкага жыцця... Прапалі б людзі*; *Жыццё, жыццё... як тая мара. К чаму так бог даў, з чаго яно пайшло?* ("Роднае карэнне"). Разам з тым у аўтарскім светапоглядзе існуе вера ў лёс (долю), які (якая) прадвызначае якасць жыцця: *Калісь тут лясы былі дрымучыя, непраходныя, у лясах людзі пням маліліся і* ***жылі са сваею доляй-нядоляю*** ("Роднае карэнне"); *О, пашлі нам,* ***доля****, наша, сваё жыццё, нашу, сваю культуру, каб усе мы свае ў сваім родным краі маглі збірацца тут, з сваімі звычаямі, сваімі ідэаламі* ("У чым яго крыўда?"). У іншых кантэкстах сцвярджаецца думка, што на свой лёс уплывае сам чалавек: *Так, браце. Што там хавацца, будзем самі сабою, будзем самі здабываць сваё* ***жыццё і долю****...* <...> *Мы самі творым жыццё, дык сорам нам звальваць, калі што не так, віну на ненармальнасці сучаснага сацыяльнага парадку* ("Роднае карэнне").

Адзначым сувязь канцэптаў *жыццё* і *шчасце*: *О, вы шчаслівыя і нешчаслівыя дзянькі ў людскім* ***жыцці****! Няма рады ўсцярэгчыся ад вас, бо схаваным ёсць ад людскога ведання, на які час вы прыпадаеце, калі вы прыходзіце і калі адыходзіце* ("У чым яго крыўда"); *і быццам* ***захмялеўшы ад радасці жыцця****, але сапраўды толькі вястуючы яшчэ большае расчараванне і сабе і ўсяму, што ёсць* ("Меланхолія").

Як трапна заўважае Т. Тарасава, "М. Гарэцкі – пісьменнік пераважна рэалістычнага плана, але ён умее працаваць з часам такім чынам, што можа спыніць, запаволіць яго, каб паказаць глыбіню перажыванняў чалавека" [4]. Так, апісваючы жыццёвы перыяд, напоўнены рэзкімі сацыяльнымі зрухамі, М. Гарэцкі ставарае яркі вобраз перамяшчэння ў часе і прасторы: *Сеў на шумнабежны воз і на крылах шпаркасці яго ў новыя, нязнаныя прасторы паляцеў. Вольныя вятры веялі мне свежым павевам. Новая эпоха мярэжыла ў тумане...* ("Скарбы жыцця"). Сувязь канцэптаў *жыццё* і *час* выяўляецца ў тым, што жыццё падзяляецца на перыяды – дзяцінства, маладосць, старасць: *Ах, гэтыя перашкоды ў вольнай творчасці паэта ў лепшую пару яго жыцця, пару маленства!* ("Ціхая плынь").

У шматлікіх кантэкстах адлюстравалася ўніверсальная архетыпавая апазіцыя *жыццё – смерць*, рэалізаваная праз антанімічнае супрацьпастаўленне ключавога слова лексемам *канец, гібель, смерць, смертухна*. Антонімы маюць значэнне 'спыненне існавання' і праз супрацьпастаўленне актуалізуюць ядзерную прымету канцэпту – 'фізіялагічнае існаванне жывога арганізма'. У тэкстах таксама выражана хрысціянскае ўяўленне пра смерць як канец жыццёвага шляху і пераход яго ў іншую, больш дасканалую, форму існавання: *Паглядзіш на жыццё яе і замаркоцішся. І памерці хочацца* ("Што яно?").

Такім чынам, даследаванне творчасці класікаў беларускай літаратуры ўяўляе безумоўную цікавасць па той прычыне, што атрыманыя вынікі не толькі даюць звесткі пра структуру і сэнсавае напаўненне нацыянальна спецыфічных канцэптаў, але і дэманструюць асаблівасці канцэптуалізацыі ўніверсалій аб'ектыўнай рэчаіснасці, у прыватнасці катэгорый быцця, у межах пэўнай этнічнай культуры. Універсальныя канцэпты, трансфармаваныя светаўспрыманнем і светаразуменнем канкрэтнага народа, з'яўляюцца базавымі элементамі кожнай нацыянальнай канцэптасферы. Прааналізаваны канцэпт *жыццё*, без сумнення, адносіцца да лінгваментальных структур такога тыпу.

Праведзенае даследаванне дазваляе вызначыць, што феномен жыцця атрымаў шматграннае і глыбокае асэнсаванне ў творчасці Максіма Гарэцкага, і гэта абумовіла багаты змест канцэпту, які ўключае як універсальныя кагнітыўныя прыметы, так і прыметы, абумоўленыя жыццёвым укладам, культурнымі асаблівасцямі, светапоглядам беларускага народа. Канцэпт *жыццё* шматмерны, у ім можна вылучыць як рацыянальнае, так і эмацыянальнае, як абстрактнае, так і канкрэтнае, як універсальнае, так і нацыянальнае і індывідуальна-асобаснае.

## Спіс літаратуры


1. **Гарэцкі, М.** Выбраныя творы / М. Гарэцкі ; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб, прадм. і камент. Т. Голуб. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 640 с.
2. **Гаўрош, Н. В.** Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 638 с.
3. **Роль человеческого фактора в языке. Язык и картина мира.** – М. : Наука, 1988. – 216 с.
4. **Тарасава, Т. М.** "Скарбы жыцця": экзістэнцыяльная аўтабіяграфія М. Гарэцкага [Электронны рэсурс] / Т. М. Тарасава. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/9942. – Дата доступу: 10.01.2023.


*Даследаванне праведзена ў рамках выканання тэмы "Лексікаграфічнае апісанне канцэптаў беларускай духоўнасці" (грант БРФФД, № ДР рэгістрацыі 20220986 ад 23.06.2022).*